■ Вернісажы

# ШЫК — ШОЎК

## Найлепшы касцюм для Шаўковага шляху

**Як нашы продкі «пазначалі» сябе вышыванкамі з асаблівым арнаментам, так і ў кітайскай культуры ёсць падобнае. Праўда, самай «кітайскай» тканінай традыцыйна лічыцца шоўк. «Цудоўным шоўкам» уражвае і здзіўляе Кітайская Народная Рэспубліка падчас Дзён культуры ў Беларусі.**



Гэта выстава ў Нацыянальным мастацкім музеі, дзе пануе вытанчанасць. І складана было б назваць яе інакш, асабліва таму, што мінулыя часы спалучаюцца ў ёй з сучаснасцю. Можна ўявіць, якія тканіны выраблялiся і як аздабляліся на працягу некалькіх стагоддзяў — з XIX-га. А яшчэ і ўявіць, як у іх выглядалі людзі — прадстаўлены прадметы адзення з шыкоўнага шоўку. Між іншым, касцюм дае ўяўленне і пра развіццё сацыяльнай сістэмы Кітая: і там быў справядлівы падыход, што сустракалі па вопратцы, праз якую выяўляўся статус. Ну, і калі гаворка пра Кітай, то тыя самыя «інь-янь» і ў касцюме сябе праяўлялі. І, безумоўна, прыгажосць кітайскай жанчыны лепш за ўсё падкрэслівае шоўк, асабліва калі на ім яшчэ вышыты вельмі тонкія ўзоры (колькі майстэрства для гэтага патрэбна!). Нездарма сярод арганізатараў выставы «Цудоўны шоўк» Музей жанчын і дзяцей Кітая, разам з Кітайскай карпарацыяй па знешніх культурных мерапрыемствах і Міністэрствам культуры КНР, якое прадстаўляў у Мінску намеснік міністра Дзін Вэй. Усё прадстаўлялася з шыкам, чаго і варты кітайскі шоўк.

Тонкая, лёгкая, зручная тканіна — адна з тых нябачных ліній, якая звязвае багатую і доўгую мінуўшчыну старажытнай кітайскай цывілізацыі і сённяшні дзень сучаснага Кітая, дзе ў XXI стагоддзі ўжо зусім іншы лад жыцця. Але традыцыі не знікаюць, калі іх працягваюць людзі, калі яны прызнаюць: «Шоўк — нацыянальнае багацце Кітая». Пра гэта расказалі нават падчас асобнага лекторыя. Як выкарыстоўваецца шоўк у сучаснай модзе КНР, паказалі мадэлі падчас адкрыцця выставы, якая будзе доўжыцца да 24 кастрычніка. Мода можа жывіцца традыцыямі і



ствараць узоры высокага мастацтва — не для кожнага дня, відаць, бо нятанна. Але кожная беларуская жанчына ў думках прымярала б гэта на сябе...

Ёсць і іншыя культурныя формы, якія вызначаюць асаблівы дух кітайскай культуры. Іх можна нават паспрабаваць асвоіць. Шоўк вырабляць, зразумела, складана. Але навучыцца выводзіць кітайскія іерогліфы (тут асабліва майстэрства, разуменне і нават правільнае размеркаванне энергіі патрэбны) можна было і паспрабаваць. Рэспубліканскі інстытут імя Канфуцыя дапамог арганізаваць майстар-клас «Мастацтва кітайскай каліграфіі». У майстра Чжан Шыміна выявы нараджаліся яшчэ і пад акампанемент нацыянальнага музычнага інструмента гу-джэн. Ну і для тых, хто любіць каштаваць смак культур — чайная цырымонія па-кітайску. Правілы ёсць. Але паспрабаваць можна і дома.

**Ларыса ЦІМОШЫК**
*tsimoshyk@zviazda.by*

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.46 | 18.02 | 10.16 |
| Віцебск — | 7.38 | 17.49 | 10.11 |
| Магілёў — | 7.36 | 17.52 | 10.16 |
| Гомель — | 7.30 | 17.52 | 10.22 |
| Гродна — | 8.01 | 18.17 | 10.16 |
| Брэст — | 7.58 | 18.21 | 10.23 |

**Месяц**

*Першая квадра ў 22.31.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

**Імяніны**

*Пр. Пелагеі, Мікалая, Сяргея, Юльяна.*
*К. Ірэны, Віталя, Яна.*



Фота Надзеі БУЖАН.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Дырэктар фірмы натнуўся на аб'яву па продажы таго ж, чым гандлюе ён сам, толькі танней, і вырашыў патэлефанаваць. І пазнаў голас вартаўніка са свайго склада.**

— А давай зробім свята! Ты ўсё прыгатуеш...
— А ты?
— А я — прыйду!

**Божа! Як жа складана быць жанчынай...**

**Вырашыла абуць іншыя туфлі, дык давялося нават трусы пераадзець!**

— Мы бяром вас на месца сакратаркі з-за знешнасці.
— Ну што гэта такое? Гэта ж чыстай вады сексізм! А як жа мой розум, прафесійныя навыкі? Гэта ж атрымліваецца, я буду проста сядзець тупой курыцай?!
— І плацім 12 мільёнаў...
— Дзе падпісаць?

**Група вопытных археолагаў падчас раскопак знайшла групу нявопытных.**

Дашнікі дасталі! Сёння сеў на ўнітаз і аўтаматычна прышпіліўся туалетнай паперай.




---

Даты | Падзеі | Людзі

### 20 КАСТРЫЧНІКА

***Штогод 20 кастрычніка сваё прафесійнае свята — Дзень повара — адзначаюць кухары і кулінары ўсяго свету. Міжнародная дата была заснавана ў 2004 годзе па ініцыятыве Сусветнай асацыяцыі кулінарных супольнасцяў.***

**1733** год — нарадзіўся Адам Нарушэвіч, беларускі гісторык, паэт, перакладчык, рэлігійны дзеяч. Вучыўся ў Пінскім калегіуме, Віленскай акадэміі, Ліёне. Выкладаў у Рыцарскай школе ў Варшаве. Набыў вядомасць як паэт, аўтар од, лірычных твораў, ідылій, баек, сатыр. З 1764 года — набліжаны караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. З 1781 года — вялікі пісар ВКЛ і сакратар (да 1786) Пастаяннай Рады, з 1788-га — епіскап Смаленскі (з месцазнаходжаннем у Пінску). Суправаджаў караля ў паездках па Беларусі і Украіне, якія падрабязна апісаў у дзённіках. Браў удзел у рабоце Чатырохгадовага сейма 1788-1792 гг. Выступаў за манархічны лад дзяржавы, моцную цэнтралізаваную ўладу. Сабраны ім 231 том гістарычных матэрыялаў, так званыя «Папкі Нарушэвіча», маюць вялікую навуковую каштоўнасць. Памёр у 1796 годзе.



**1885** год — 130 гадоў таму нарадзіўся (г. Вільня) Аляксандр Лаўрэнцьевіч Бурбіс, удзельнік беларускага нацыянальна-вызвалenчага руху, тэатральны дзеяч. З 1921 года — намеснік наркама замежных спраў БССР, адзін з арганізатараў Таварыства Чырвонага Крыжа БССР. Ідэі, погляды і дзейнасць Бурбіса аказалі ўплыў на фарміраванне дзяржаўнай палітыкі БССР у 1920-я гг., садзейнічалі ўзбуйненню тэрыторыі БССР. Аўтар «Кароткага нарыса па эканамічнай геаграфіі Беларусі», артыкула «Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху». Адзін з заснавальнікаў беларускага прафесійнага тэатра, акцёр і рэжысёр. Удзельнічаў у рабоце Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага, Беларускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні. Паставіў спектаклі «Па рэвізіі» і «Прыкінуліся дурнямі» М. Крапіўніцкага, «Сватаўство» В. Дуніна-Марцінкевіча. Памёр у 1922 годзе.

**1891** год — нарадзіўся Джэймс Чэдвік, англійскі фізік, які адкрыў нейтрон, нобелеўскі лаўрэат. Думка пра існаванне гэтай элементарнай часціцы прыйшла ў галаву Чэдвіку яшчэ ў гады яго вучнёўства, калі ён працаваў з Рэзерфордом. Разам яны высветлілі, што атам у цэлым нейтральны, таму што зарад пратонаў у ядры супадае з зарадам электронаў. Але гэта зусім не тлумачыла масы ядра, якая значна перавышала масу пратонаў, якія павінны былі ў ім знаходзіцца. Адзіным выключэннем быў атам вадароду. Шмат часу фізік займаўся вывучэннем распаду лёгкіх ядраў пад уздзеяннем бамбардзіроўкі альфа-часціцамі. Думка пра нейтральную часціцу, тым не менш, не пакідала яго, і ён шукаў спосаб даказаць яе існаванне. А ў 1930 годзе нямецкія вучоныя заўважылі, што пры бамбардзіроўцы берылію альфа-часціцамі ён выпускае асаблівае выпраменьванне, якое валодае павышанай пранікальнай сілай. Чэдвік выказаў здагадку, што гэта і ёсць паток нейтральных часціц. Пазней шэрагам доследаў ён пацвердзіў сваю гіпотэзу. Адкрыццё нейтрона, нейтральнай часціцы, якая не адштурхоўвалася ад дадатнага ядра і магла выбіваць з яго пратоны, было першым крокам да расшчаплення ядра урану. За важнае адкрыццё Чэдвік быў узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй ў 1935 годзе.

### Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:**
*«Там, дзе пачынаецца абыякавасць, там недалёка і гібель».*

---

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.654. Індэкс 63850. Зак. № 4154.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 19 кастрычніка 2015 года.